# «НЕПАХАВАНЫХ САЛДАТАЎ ЯШЧЭ ЛЯЖЫЦЬ ШМАТ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Якая па ліку для цябе была гэта экспедыцыя?***

— Менавіта экспедыцыя — чацвёртая з 2017 года. Мы прапусцілі 2020 год з-за пандэміі. Экспедыцыі звычайна арганізоўваюцца пошукавым рухам краін, на тэрыторыі якіх адбываліся баі Вялікай Айчыннай вайны. Як правіла, яны доўжацца некалькі тыдняў.

***— Як сутыкнулася з гэтым рухам?***

— Займалася генеалогіяй сваёй сям'і і шукала звесткі пра матчынага дзядзьку Канопліча Антона Уладзіміравіча з вёскі Дзярбінка Ельскага раёна. Ва ўзросце 22 гадоў у ліпені 1941 года ён быў прызваны ў армію і лічыўся прапаўшым без вестак. На ўстанаўленне яго лёсу мне спатрэбілася некалькі гадоў. Праз сацыяльныя сеткі пазнаёмілася з вядомым пошукавікам Аляксеем Кісліцыным, які працуе з нямецкімі архівамі. Ён знайшоў ідэнтыфікатар, па якім зрабіла запыт у нямецкі архіў, там мне паведамілі лагерны нумар стрыечнага дзеда, абставіны, пры якіх ён трапіў у палон (5 ліпеня ў Луцку), назвы рабочых каманд, у складзе якіх лічыўся, і выслалі яго фатаграфію, зробленую для карткі ваеннапалоннага, яна аказалася адзінай у сям'і. Гэты адказ я чакала дзевяць месяцаў і атрымала яго, калі вярнулася з першай сваёй ваенна-археалагічнай экспедыцыі ў Карэлію.

Цяпер мы ведаем, што Антон Каноплiч пахаваны на брацкіх могілках Шталага — ХВ у нямецкім горадзе Замбасцель. Нам даслалі фота мемарыяла, дзе ўвекавечана яго імя, архіўныя фота лагера і кантакты даглядчыка могілак.

Поспех у гэтым пошуку і набытыя кантакты падштурхнулі дапамагаць шукаць іншых людзей.

***— Хто запрасіў на першую вахту?***

— Сама напрасілася. Прачытала кнігу Аляксандра Савельева «Пахавальная каманда», знайшла яго ў сацыяльных сетках і спытала, ці можна з ім на вахту. Ён пагадзіўся. Калі ўжо села ў цягнік, мне адразу захацелася выйсці, адчула, што пагарачылася ў сваіх патрыятычных памкненнях, падумала, што ўвязваюся ў незразумелую аферу, еду невядома куды, стала страшна, успомніла, што ў мяне на ўтрыманні дачка і два каты. Вырашыла: выйду ў Жодзіне, а Савельеву скажу, што спазнілася на цягнік або забыла пашпарт. Але з-за таго, што напярэдадні з-за нерваў не спала двое сутак, лягла і адразу заснула і прачнулася ўжо на граніцы...

Тое, што ўбачыла ў Карэліі, нагадвала фільм у жанры «містыка»: усе пазіцыі, бліндажы, траншэі, калючы дрот на балоце захаваліся, толькі людзі зніклі. Мы працавалі на гары Ганкашваара — пасярод балота невялікая выспа, узгоркі пад Лагойскам вышэйшыя. Калі ідзеш па балоце, усё пад табой калышацца. Калі рыдлёўкай праткнуць мох, вада выпырсквае фантанам, а мох можна скруціць дываном і адразу пад ім убачыць салдата.









Некаторыя захаваліся добра, амаль цалкам, нібы загінулі ўчора, ад некаторых засталіся толькі пазногці ад вялікіх пальцаў у чаравіках. Ад усяго астатняга толькі відаць адбітак на зямлі, дзе ляжала цела, падобны на цень, і месца гэта быццам алеістае.

Спачатку шакіравала ўсё: што ляжу пасярод лесу, што ў дзве гадзіны ночы бачу вясёлку, што сонца не заходзіць, што бэз цвіце ў жніўні, што пад мохам можна намацаць лёд, што сяку дровы, вару на кастры... Была перапоўненая ўражаннямі.

Было адчуванне прысутнасці некага, акрамя ўдзельнікаў вахты. Здавалася, што хтосьці за намі назірае. Гэта не пужала. І на іншых вахтах такога не было.

## «Было такое, што плячом бярозы валілі»

***— Ты была адзінай жанчынай?***

— Жанчын, як правіла, шмат і ўсе розныя. Журналістка, сакратар вясковай школы, студэнтка, пенсіянерка... Пазней пасябравала з Юляй, сцюардэсай.

Да гэтага мне здавалася: калі ўбачу чалавечыя косткі, то альбо страчу прытомнасць, альбо буду плакаць і не змагу да іх дакрануцца... Але там панавала такая атмасфера, што нічога з гэтага не здарылася, і я ў той жа дзень змагла спакойна працаваць з чалавечымі астанкамі. Пошукавікі звяртаюцца да іх вельмі цёпла: «Ну, пакажы, мужык, што там у цябе ў кішэньках? О, дык у цябе партыйны білет! І грошыкі яшчэ ў кашальку! Дык ты запаслівы!» Смех і жарты дапамагаюць навічкам хутка адаптавацца да спецыфікі работы. Дарэчы, да чалавечых астанкаў мы, пошукавікі, адносімся як да жывых людзей. Ніколі не кінем костку, нават маленькую, на пакет, дзе раскладаем астанкі. Калі не дацягваемся — падымаемся, падыходзім і кладзём. Заўсёды ёсць адчуванне, што гэта — жывы чалавек. Калі ўдаецца ўбачыць яго фатаграфію, знайсці потым сваякоў, тады ўвогуле з'яўляецца адчуванне прыналежнасці да яго лёсу.

***— Сніліся?***

— Ні разу. Хоць я чалавек эмацыянальны і ўражальны. Аднойчы прыснілася, што сяджу ў танку, сяброўка падае патроны, а я ёй кажу: «Юля, не бачу, куды страляць!». Яна адказвае: «Зараджай! Камандзір бачыць, куды страляць!»

На першай вахце быў выпадак: мы ўжо ляглі спаць у палатцы, стомленыя, раздражнёныя, на вуліцы дождж, і падчас правальвання ў сон пачула над левым вухам мужчынскі голас: «Хачу дадому!». Раніцай хлопец, з якім мы працавалі ў пары, кажа: «Пакажы пальцам, куды пойдзем», паказала, і мы знайшлі салдата, пры ім была лыжка, падпісаная прозвішчам «Ісачэнка». У той дзень мы яшчэ траіх паднялі, адзін з партбілетам, але засталася толькі вокладка, старонкі не чыталіся. Але такое было аднойчы.

***— Табе дапамагалі ў першую тваю вахту?***

— Вядома. Сама не магла рыдлёўку ўваткнуць. Зараз і падразаю, і знімаю, і зачышчаю — рыдлёўка ў мяне як працяг рукі. А ў першую вахту нам падрыхтавалі раскоп, і мы з дзяўчатамі нажамі ачышчалі косткі і падымалі. Было такое, што плячом бярозы валілі. Калі бачым, што шкілет пад каранямі, падразаем карані, плячом цíснем на дрэва. Першы мой самастойна, па ўсіх археалагічных правілах падняты «баец», — конь у вупражы. Гэта ўжо была другая мая вахта. У Карэліі сама байцоў не знаходзіла, але дапамагала падымаць знойдзеных. Наступным годам паехала ў Мясны Бор (вёска у Наўгародскай вобласці Расіі), дзе ўвесну 1942 года трапіла ў акружэнне і загінула 2-я ўдарная армія Волхаўскага фронту.

Мы хадзілі па лесе цэлы дзень. Знайшлі настрэл...

***— Што такое настрэл?***

— Месца, усыпанае пустымі стралянымі гільзамі. На іх рэагуе металашукальнік, і гэта нагода шукаць байца. Мы ўсё акуратна выбралі, але гэта аказаўся конь.

***— Наколькі ўдзел у раскопах небяспечны з пункту погляду санітарыі?***

— У месцы, адкуль мы паднялі байца, за ноч збіраецца вада, мы бяром яе і выкарыстоўваем для ежы, піцця і мыцця. Ніхто не захварэў. Дзікія жывёлы больш небяспечныя. У Карэліі параўнальна недалёка ад месца, дзе мы працавалі, мядзведзь з'еў чалавека, і ад гэтага было не па сабе. Сама ніякіх жывёл не бачыла, але адбіткі ног лася вакол нашай палаткі раніцай знаходзіла.

Для мяне адкрыццём стала паходная лазня, якую прывезлі татары. Гэтая палатка два на два з буржуйкай, дазваляе абмыцца цёплай вадой — раскоша!

У Беларусі працуем па запрашэнні мясцовых атрадаў пад абавязковым наглядам пошукавага батальёна Міністэрства абароны, Следчага камітэта, групы размініравання. Так што цалкам бяспечна. Летась ездзілі пад Полацк, Слонім, Жлобін, Жыткавічы.

***— Чаму ў такія экспедыцыі бяруць валанцёраў?***

— Думаю, па-першае, таму што яны — людзі не выпадковыя. Гэта асэнсаваны выбар і дакладнае разуменне пошукавай работы. Прыходзяць такія, як я — хто шукаў сваіх і вырашыў заняцца пошукам. І моладзь са спецыялізаваных арганізацый, студэнцкіх пошукавых атрадаў. Дарэчы, у Расіі ёсць добрая практыка набіраць у імянныя класы (у гонар земляка — героя) найлепшых вучняў. У такіх класах прэстыжна вучыцца. Непаўналетнім забаронена ўдзельнічаць у экспедыцыях, але яны дапамагаюць працаваць з архівамі, у музеях і праз гэтую работу далучаюцца да пошукавага руху.

Па-другое, важна перадаваць эстафету. Бо тым, хто пачынаў займацца пошукам непахаваных байцоў (гэта было ў канцы 80-х гадоў), ужо за 70—80 гадоў, і патрэбны новыя людзі. А непахаваных салдатаў яшчэ ляжыць шмат. Канца не відаць. Была на канферэнцыі, дзе прыводзілі статыстыку: за адзін год паднялі дзясяткі тысяч салдат усе атрады ў сукупнасці на ўсёй тэрыторыі, дзе вяліся баявыя дзеянні: Польшча, Аўстрыя, Літва, Латвія, тэрыторыя СНД. І такая колькасць перапахавання штогод.

## «Гэта адны з самых моцных эмоцый у жыцці»

***— Чаму хаваць байцоў пачалі толькі праз 40—50 гадоў пасля заканчэння вайны?***

— Для тых, хто перажыў вайну, смерць стала звычайнасцю. Задача была аднавіць краіну. Старажылы вёскі Мясны Бор на расійскай Наўгародчыне расказвалі, што пасля вяртання з эвакуацыі яны нават у лес не хадзілі, бо летам адтуль ішоў трупны пах. Потым сталі выцягваць адтуль тэхніку, бо патрэбны быў метал. Трэба памятаць і пра тое, што мужчын засталося мала, не было каму займацца перапахаваннем салдат, ды і мужчынскую работу тады рабілі жанчыны і падлеткі.

***— Чаму цябе зацягнула?***

— Даўгі сумлення. Шчыра кажу. Лічу, што па-чалавечы правільна, каб іх пахавалі з воінскім ушанаваннем, нават калі імя засталося невядомым. Каб аддалі салют, каб за іх памаліўся святар. Каб байцы набылі вечны спачын. Каб не былі забытыя.

***— Што адчуваеш, калі пахаванне адбываецца праз 80 гадоў пасля гібелі?***

— Плачу ўголас. Але гэта слёзы не ад тугі, не ад жалю, а ад урачыстасці моманту і ад адчування, што справядлівасць перамагла. Напэўна, гэта слёзы радасці. Калі пахаванне завершана, мне падаецца, што само паветра стала іншым. Лягчэй дыхаецца. Гэта адны з самых моцных эмоцый у жыцці.

Хвалююся, калі паведамляю сваякам. Гэта трэба рабіць вельмі далікатна. Яны спачатку не могуць зразумець, а потым не могуць паверыць... Гісторыі ёсць розныя. Бывае, што адмаўляюцца ад сваіх, не маюць цікаўнасці. Такога не павінна быць. Бывае, што дачка ўсё жыццё шукала звесткі пра бацьку, а калі мы яго знаходзім, губляецца, не ведае, што рабіць. Бывае, што дзве жанчыны з Казахстана з хворымі нагамі, за 60 абедзвюм, ідуць сем кіламетраў па балоце, каб пакласці далоні на месца, дзе 80 гадоў праляжаў іх дзед. Іншыя пошукавікі расказвалі, як пару гадоў таму паднялі байца, у гімнасцёрцы яго былі дзіцячыя цацкі: машынка і лялька. Дзеці далі на памяць.



Знайшлі родных: сын не дачакаўся, але жывыя дачка і 98-гадовая жонка. Жонка з маманту расстання захоўвала кісет з тытунём, які ў спешцы забыла пакласці ў рэчы мужа. І калі яна паклала на вечку труны той кісет...

На перапахаваннях мы, жанчыны, адыходзім плакаць у бок, мужчыны таксама ідуць далей ад чалавечых вачэй.

Часта складваем у труны па 10 чалавек. Падзяліць іх немагчыма: усе косткі перамяшаліся, і мы толькі кладзём рэбры з рэбрамі, чарапы з чарапамі... І калі зробіш гэта, закрыеш вечка труны, то адчуванне, што яны дайшлі. Набылі спакой. Дзіўнае пачуццё. Думаеш: колькі іх там яшчэ, у палях, балотах, лясах і агародах, пад дарогамі... Але вось гэтыя ўжо супакоіліся. І ў самога нейкае супакаенне. Быццам падзякаваў ім. Яны замест цябе ляглі, а ты зараз іх сабраў акуратна і пахаваў.

***— Відаць, як яны памiралі?***

— Баец ляжыць з вінтоўкай, побач разарваны індывідуальны медыцынскі пакет, значыць, быў паранены. Па костках відаць старыя раны, якія ўжо зажылі на момант смерці — засталіся рубчыкі. Калі асколак захрас у тазавай косці — загінуў ад гэтага. Кулі ў рэбрах... Каска з захраслай куляй і адбіткам валасоў унутры, бо запякліся з крывёю. Па пэўных прыкметах, якія маюць чалавечыя астанкі, можна вызначыць узрост байцоў. Глядзіш і думаеш: тут зусім дзеці, а гэты — ужо вопытны, можа, і грамадзянскую прайшоў. Дзіўна, але да кожнага адчуваю нейкае мацярынскае пачуццё. Нібы тая бабуля, што клапатліва папраўляе каўнерык на гімнасцёрцы ўнука.

У баявых зводках ёсць інфармацыя пра атаку, колькасць асабовага складу, яе ход. Але ўсё роўна не магу ўявіць сабе тое пекла, якое там адбылося.

***— Калі заканчваецца экспедыцыя, што ты адчуваеш?***

— Сяджу ў офісе і не разумею, што тут раблю. Хочацца хутчэй зноў у экспедыцыю. У экспедыцыі мы ўсе роўныя, сапраўдныя, і задавальненне адчуваю больш. Таму апошнія гады выдаткоўваю на гэта амаль усе свае выхадныя, адгулы і працоўныя водпускі.

У горадзе чую размовы ў транспарце, гляджу на модную моладзь і думаю пра выпрабаванні, што выпалі на долю тых, хто ваяваў. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Мікулін — адзін з тых, хто выжыў пад Псковам, у сваіх «Успамінах пра вайну» пісаў, як яны галодныя спалі ў мокрых шынялях і валёнках, бо вогнішча раскласці было небяспечна, як прачыналіся па пояс у вадзе... А яны ж яшчэ выконвалі баявыя задачы і ў іх быў баявы дух.

Часам думаю пра тое, што многія інтарэсы сучаснага чалавека не маюць ніякай каштоўнасці.

***— А што мае каштоўнасць?***

— Дзеці. Новае пакаленне. Працяг роду. Яшчэ — простая ежа. Мне цяпер бессэнсоўнай здаецца вось гэтая гонка навокал. Ёсць дах над галавой, работа — і добра.

***— Захапілася вывучэннем гісторыі вайны?***

— Гэта стала вытворчай неабходнасцю. Чытаю баявыя данясенні, апаратыўныя зводкі, даведваюся пра ваенныя аперацыі, іх асаблівасці, страты. Але гісторыю заўсёды любіла і пра Вялікую Айчынную вайну дастаткова шмат ведала. Гэта было прывіта з дзяцінства. Наша пакаленне чула жывы голас ветэранаў. На жаль, моладзь не адчувае таго, што адчуваем мы.

***— Што думаеш пра неапраўданыя страты ў той вайне?***

— Не згодная з такім вызначэннем. Перамога шматнацыянальнаму савецкаму народу, на жаль, дасталася цаной неверагоднай, жудаснай колькасці ахвяр, але, я ўпэўнена, ніводная ахвяра не была дарэмнай і бессэнсоўнай. Часта так кажуць дылетанты. Сама вывучаю архіўныя дакументы, баявыя распараджэнні і магу рабіць пэўныя высновы. ...Хлопчыкі з тонкай шыяй, у касках, што матляюцца, учора яны танцавалі на выпускным балі, а сёння аказаліся на полі, дзе ад выбухаў не зразумела, дзе неба, а дзе зямля, яны аддалі свой доўг радзіме цалкам. Як і іншыя людзі, розных узростаў, заняткаў, полу, поглядаў, нацыянальнасцяў — усе аб'ядналіся, каб адстаяць сваю радзіму.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**


## ООО «Юридическая компания Аспект»

проводит первые торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Техдоримпорт»

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот с учетом НДС 20 %, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Подметально-уборочная машина Scandia 2W, 2012 г. в., артикул 802500-05, производитель – BRODD SWEDEN AB, Швеция | 64 473,60 | 3 223,68 | 6 447,36 |

*Торги назначены на **03.08.2022 в 10.30** по адресу **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4 этаж)**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **01.08.2022** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30).*

| | |
|---|---|
| Продавец | ООО «Техдоримпорт» |
| Организатор торгов | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| Реквизиты для оплаты задатка | **Бенефициар – ООО «Юридическая компания Аспект» p\c № BY05TECN30120738300060000000 в ОАО «Технобанк», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 191366886** |

**Условия торгов**

• к участию в торгах допускаются лица, заключившие с организатором торгов договор о задатке, внесшие денежный задаток, представившие организатору торгов в установленный срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов и зарегистрированные в соответствующем журнале;
• лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением копию платежного документа с отметкой банка об исполнении, подтверждающего внесение задатка на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА. При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:
- юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;
- юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом Республики Беларусь): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;
-ИП: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;
- представителем гражданина Республики Беларусь, ИП: нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;
• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;
• договор купли-продажи подлежит подписанию в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов;
• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов (лот);
• в случае если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов (лот) продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;
• победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмета торгов (лота) по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает стоимость предмета торгов (лота) за вычетом суммы внесенного задатка в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания договора купли-продажи; иной срок для оплаты предмета торгов (лота) может быть определен соглашением сторон

Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8 (017) 3480699 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30).
Ознакомиться с предметом торгов возможно по месту нахождения имущества, после предварительного согласования по тел.+ 375 (44) 5986627

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Логойским сельским исполнительным комитетом (организатор аукциона) по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Гостиловичи, ул. Весенняя, 25, кадастровый номер 623284601601000372 | 0,1120 | газификация, электрификация, водоснабжение | 20 000,00 | 2000,00 | 2132,07+ расходы за размещение объявления |
| 2 | аг. Косино, ул. Школьная, 85Б, кадастровый номер 623284603201000369 | 0,1494 | газификация, электрификация, водоснабжение | 9 000,00 | 900,00 | 2391,37 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 3 августа 2022 в 10.00 по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, Логойский сельский исполнительный комитет, контактные. тел.: (801774) 28473, (8029) 1779511.
**Прием документов** по 28.07.2022 включительно;
Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Минский областной исполнительный комитет: http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/ Логойский районный исполнительный комитет: http://www.logoysk.gov.by
УНП 600181577

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению УП «Випра» (продавец имущества) в лице управляющего в деле о банкротстве – ИП Яцына И. В. извещает о проведении 18 июля 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов:** г. Гомель, Троллейбусный проезд, 4 | | | | |
| **1** | Автомат отрезной круглопильный 85663-100 (инв. № 822) | **4 410,00** | 220,50 | 441,00 |
| **2** | Автомат токарно-револьверный одношипный (инв. № 881) | **1 350,00** | 67,50 | 135,00 |
| **3** | Автомат токарно-револьверный 1Д112 (инв. № 766) | **1 170,00** | 58,50 | 117,00 |
| **4** | Зубофрезерный горизонтальный станок 5303В (инв. № 796) | **1 800,00** | 90,00 | 180,00 |
| **8** | Зубофрезерный станок 530П (инв. № 781) | **864,00** | 43,20 | 86,40 |
| **9** | Пресс КД 2126 (инв. № 779) | **4 590,00** | 229,50 | 459,00 |
| **10** | Пресс КД 2128 зав.№1188 (инв. № 772) | **6 120,00** | 306,00 | 612,00 |
| **11** | Пресс однокривошипный КБ 2326 (782) (инв. № 505) | **3 420,00** | 171,00 | 342,00 |
| **12** | Пресс однокривошипный КД 2126 (1656) (инв. № 762) | **3 690,00** | 184,50 | 369,00 |
| **13** | Пресс однокривошипный КД 2126 (1661) (инв. № 763) | **3 690,00** | 184,50 | 369,00 |
| **14** | Токарный автомат 1Б10В (4210-86) (инв. № 819) | **1 800,00** | 90,00 | 180,00 |
| **15** | Специальный сверлильный станок 2520-056 (гориз.) (инв. № 920) | **3 690,00** | 184,50 | 369,00 |
| **16** | Настольно-сверлильный станок (инв. № 258) | **630,00** | 31,50 | 63,00 |
| **17** | Молот ковочный пневматический 4134А (880) (инв. № 750) | **6 570,00** | 328,50 | 657,00 |
| **18** | Машина швейная Siruba F007J-W122-356/FHA (инв. № 4762) | **1 170,00** | 58,50 | 117,00 |
| **19** | Машина швейная Siruba F 007J-W122-3 (инв. № 4792) | **1 170,00** | 58,50 | 117,00 |
| **20** | Машина швейная Siruba T828 (инв. № 4785) | **1 530,00** | 76,50 | 153,00 |
| **22** | Токарно-винторезный станок 1К-62 (инв. № 31) | **1 980,00** | 99,00 | 198,00 |
| **23** | Пресс однокривошипный КД 2320 (инв. № 212) | **1 350,00** | 67,50 | 135,00 |
| **24** | Круглошлифовальный бесцентровой универсальный станок 3М182 (инв. № 360) | **3 600,00** | 180,00 | 360,00 |
| **25** | Плоскошлифовальный универсальный станок 3Г71М (инв. № 430) | **2 970,00** | 148,50 | 297,00 |

**Продавец:** Унитарное предприятие «Випра», г. Гомель, Троллейбусный проезд, 4. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029)653-92-88 управляющий в деле о банкротстве – ИП Яцына Игорь Валерьевич. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчётный счет **Продавца имущества (УП «ВИПРА»):** р/с BY11 BLBB 3012 0400 0585 7800 1007 в дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области , БИК BLBBBY2X, УНП 400058578, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 4 июля 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 14 июля 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов). Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 №415-З (ред. От 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» Ст.127-129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.03.2022 № 61 (29683). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029)126-66-62, 8 (044)599-18-16**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 452/С-5167 (назначение – здание специализированное розничной торговли (магазин), наименование – магазин), общей площадью 92,4 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский с/с, д. Мадейки;
- капитальное строение, инв. № 452/С-5168 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад магазина), наименование – склад), общей площадью 39,4 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский с/с, д. Мадейки.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422682003202000042, площадью 0,0650 га по адресу Зельвенскийс/с, д. Мадейки.
Начальная цена продажи лота 1 000 р. (одна тысяча рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 50 р. (пятьдесят рублей).
ЛОТ 2:
- капитальное строение, инв. № 452/С-5530 (назначение – здание специализированное розничной торговли (магазин), наименование – магазин), общей площадью 191,0 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский с/с, д. Кривоконно;
- капитальное строение, инв. № 452/С-5531 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад магазина), наименование – склад магазина), общей площадью 31,0 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский с/с, д. Кривоконно.
Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422682003102000096, площадью 0,1644 га по адресу Зельвенскийс/с, д. Кривоконно.
Начальная цена продажи лота 1 800 р. (одна тысяча восемьсот рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 90 р. (девяносто рублей).
ЛОТ 3:
- капитальное строение, инв. № 452/С-5158 (назначение – здание специализированное розничной торговли (магазин), наименование – капитальное строение), общей площадью 77,6 кв. м, расположенное по адресу Зельвенский с/с, д. Конно;
- капитальное строение, инв. № 452/С-5159 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад магазина), наименование – склад магазина), общей площадью 42,7 кв. м, расположенное по адресу Зельвенский с/с, д. Конно;
- оборудование: охранная сигнализация, аппарат бытовой отопительный АОТВ-10.1.
Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422682002602000143, площадью 0,1029 га по адресу: Зельвенскийс/с, д. Конно.
Начальная цена продажи лота 1 800 р. (одна тысяча восемьсот рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 90 р. (девяносто рублей).

Продавец – Зельвенский филиал Гроднооблпотребобщества, 231940, г. п. Зельва, ул. Советская, 25, тел. 8-01564-3-18-92

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 15 июля 2022 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 02.02.2021 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 13 июля 2022 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
https://grino.by/aukcion